седателя П
тета Юрий

ПРЭЗЕНТАЦЫІ






# Тамара АЎСЯННІКАВА: «Трэці том – адзін з самых важных»

## 360 вершаў Яўгеніі Янішчыц надрукаваны ўпершыню

**Чарговы дзень нараджэння знакамітай беларускай паэтэсы Я. Янішчыц, якая нарадзілася 20 лістапада 1948 года, адзначыўся важнай падзеяй: у Пінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбылася прэзентацыя 3-га тома 4-томнага выдання «Яўгенія Янішчыц. Творы, жыццяпіс, каментарыі».**

Нагадаю, што першы том чатырохтомніка выйшаў у свет у 2016 годзе, другі – у 2017-м. Падрыхтавалі кнігу да выдання старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Святлана Калядка і паэтэса, аднакурсніца і сяброўка Яўгеніі Янішчыц Тамара Аўсяннікава. Унікальнасць 3-га тома ў тым, што сярод 780 прадстаўленых твораў каля 360 вершаў чытач убачыць упершыню.

Трэці том кнігі «Яўгенія Янішчыц. Творы, жыццяпіс, каментарыі» складаецца з раздзелаў «Творы, якія публікаваліся», «Творы з архіваў, музея», «Вучнёўскія і недапрацаваныя творы», «Навуковыя каментарыі» і «Дадаткі».

Дзякуючы падтрымцы сына паэтэсы Андрэя Янішчыца, яе пляменніцы Таццяны Ганчарык і дырэктара літаратурнага музея Яўгеніі Янішчыц у вёсцы Парэчча Антаніны Сідарук аўтары 3-га тома атрымалі доступ да ўсіх магчымых матэрыялаў: ад запісаў вершаў на асобных лістах да машынапісных тэкстаў, гатовых для выдання зборнікаў.

**(Заканчэнне на 4-й стар.)**

**Фота Іны УРБАНОВІЧ**

## Тамара АЎСЯННІКАВА:

# «Трэці том – адзін з самых важных»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

У 3-ці том таксама ўвайшлі ўспаміны пра Яўгенію Янішчыц 46 аўтараў, 7 з якіх публікуюцца ўпершыню. Сярод іх паэты, празаікі, журналісты, знаёмыя, а таксама маці паэтэсы. Гэтыя ўспаміны былі запісаны Тамарай Аўсяннікавай.

– Я вельмі рада, што ў гэты том уключаны ўспаміны пісьменнікаў, журналістаў з Берасцейшчыны, – адзначыла Тамара Пятроўна. – Тут і Мікола Панасюк, і Марыя Ляшук, Анатоль Крэйдзіч, Зінаіда Дудзюк і многія іншыя. Таму гэты том вельмі важны для пінчукоў. Мы таксама вельмі ўдзячны Аляксандру Львовічу Ільіну за тое, што ён змог адлюстраваць у сваім артыкуле першыя творчыя крокі Жэні. Апрача таго, сюды ўключылі ўспаміны і артыкулы тых аўтараў, якія былі надрукаваны раней, але не ўвайшлі ў першыя зборнікі. Гэта ўспаміны Генрыха Далідовіча, Віктара Шніпа, Ніны Мацяш, Раісы Баравіковай і іншых. На маю думку, гэтая кніга – адна з самых важных у чатырохтомніку, таму што сюды ўвайшло многа новага, тое, што некалі друкавалася раней, напрыклад, у газетах, часопісах, але з цягам часу забылася ці згубілася.

Тамара Пятроўна расказала ўсім прысутным, чаму 3-ці том атрымаўся менавіта такім, і адказала на ўсе пытанні, але перш за ўсё перадала прывітанне ад калегі Святланы Калядкі, якая, на жаль, не змагла прысутнічаць на прэзентацыі кнігі, але абяцала прыехаць, калі выйдзе 4-ты том.

Тамара Пятроўна адзначыла, што падчас складання кнігі было многа развагаванняў над тым, што ўключаць у яе, а што не. Так, папярэдне не планавалася ўключаць у выданне вучнёўскія вершы. Але потым прыйшлі да высновы, што для даследчыкаў, для школьнікаў і наогул для аматараў паэзіі Яўгеніі Янішчыц будзе цікава прасачыць, як развіваўся яе талент, як ён паступова рос, мужнеў, як яна стала высокапрафесійным паэтам.

Тамара Аўсяннікава падкрэсліла таксама, што ў зборніку адзначана, што вершы Яўгеніі Янішчыц перакладаліся і на польскую, і на французскую мовы. І ўжо ёсць дамова з сербскай паэткай Даянай Яшкевіч, якая хутка будзе перакладаць вершы Я. Янішчыц на сербскую мову. Засталося толькі выбраць 50 вершаў.

Тамара Пятроўна расказала, што ўжо распрацавана канцэпцыя 4-га тома выдання, у якое плануецца ўключыць лісты Яўгеніі Янішчыц да родных, блізкіх людзей, сяброў, да паэтаў, журналістаў, яе выступленні і крытычныя артыкулы. Кніга пабачыць свет у хуткім часе, магчыма, у будучым годзе. Тым не менш укладальнікі выдання будуць рады, калі ў каго нешта засталося ад Жэні з яе творчасці, запісаў, чым можна падзяліцца і ўключыць у зборнік.

У прэзентацыі прынялі ўдзел прыхільнікі творчасці Яўгеніі Янішчыц, тыя, хто неабыякавы да яе асобы, родныя і сябры. Гэта пляменніца Яўгеніі Іосіфаўны Таццяна Ганчарык, яе сын Уладзімір, стрыечная сястра Раіса Баран, члены клуба літаратараў Піншчыны «Пінчукі», навучэнцы Пінскага каледжа мастацтваў.

**Іна УРБАНОВІЧ**